# І НОВАЕ, І НЕ ЗАБЫТАЕ СТАРОЕ

## Беларусь гатова развіваць супрацоўніцтва з Венгрыяй па ўсіх кірунках

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі Петэрам Сіярта.**

У пачатку сустрэчы беларускі лідар падзякаваў Венгрыі, яе лідару і свайму суразмоўніку асабіста, бо ён перш за ўсё адказвае за знешнепалітычны курс, за тое добрае, што было зроблена для Беларусі, асабліва за нармалізацыю адносін паміж нашай краінай і Еўрапейскім саюзам. «Мы пра гэта ведаем аж да літары і коскі, мы гэта вельмі цэнім, і гэта адзін з краевугольных камянёў падмурка нашых адносін», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адным асноўным каменем у падмурку супрацоўніцтва Прэзідэнт назваў гандлёва-эканамічныя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі. «Можна казаць, што ў нас ёсць тавараабарот, і ён вагаецца дзесьці ў межах 180—200 млн долараў па годзе, але давайце адкрыта скажам, што гэта смешная лічба. Улічваючы нашы патэнцыялы, улічваючы тое, як мы былі кааперавaныя ў свой час, гэта толькі пачатак, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І я вам хачу сказаць: мы гатовы па ўсіх кірунках прасоўваць наша гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва».

Беларускі лідар заклікаў выкарыстоўваць у гэтым членства Беларусі ў ЕАЭС, адносіны з Кітаем, у прыватнасці эканамічны праект Шаўковы шлях.

«Лагістыка выбудавана, мы гатовы тут прадстаўляць вашы інтарэсы. У той жа час мы разлічваем на тое, што вы, як член Еўрапейскага саюза, прытым вельмі самастойны, які мае сваю пазіцыю, будзеце нас падтрымліваць. І спалучэнне гэтых інтарэсаў надасць вялікую гандлёва-эканамічную дынаміку паміж дзвюма краінамі», — дадаў ён.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што не бачыць неабходнасці гаварыць асобна пра канкрэтныя праекты, паколькі яны ёсць ва ўсіх сферах — не толькі ў машынабудаванні і фармацэўтыцы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што асабіста памятае сувязі па фармацэўтычнай лініі яшчэ з савецкіх часоў. Паводле яго слоў, у нашай краіне да гэтага часу вялікі попыт на венгерскія лекі. Але ў Беларусі і Венгрыі ёсць магчымасці працаваць па ўсіх кірунках.

«Вы хочаце — і правільна — аднавіць вытворчасць «Ікарусаў», маіх любімых аўтобусаў. Мы гатовыя прапанаваць вам практычна бясплатна гэтую падтрымку, таму што мы прайшлі вельмі сур'ёзны шлях будаўніцтва падобных аўтобусаў на больш высокай аснове ў Беларусі», — сказаў беларускі лідар.

У адказ венгерскі міністр замежных спраў і знешняга гандлю падзякаваў кіраўніку дзяржавы за магчымасць асабістага прыёму, а таксама падзякаваў міністру замежных спраў Беларусі Уладзіміру Макею за работу, накіраваную на развіццё двухбаковых адносін дзвюх дзяржаў.

Ён нагадаў, што Венгрыя — краіна ў Цэнтральнай Еўропе, якая памятае гісторыю і ведае, што ёй нашмат лепш, калі паміж Захадам і Усходам існуе супрацоўніцтва. Петэр Сіярта падкрэсліў: гэтая ідэя з'яўляецца нацыянальным інтарэсам венгерскага народа. «Мы хочам аб'яднаць свае намаганні з усімі, хто лічыць супрацоўніцтва паміж Усходам і Захадам важным. І таму працуем над тым, каб Беларусь магла больш цесна супрацоўнічаць з Еўрапейскім саюзам», — сказаў ён.

Па выніках сустрэчы венгерскі міністр пагутарыў з журналістамі. Дарэчы, Беларусь і Венгрыя падпісалі пагадненне аб узаемнай абароне інвестыцый, што адкрывае новыя магчымасці для супрацоўніцтва дзелавых супольнасцяў. Яшчэ ў рамках беларуска-венгерскай кааперацыі плануецца адкрыццё ў Венгрыі лініі па вытворчасці вагонаў для чыгунак (усяго трэба будзе вырабіць 19 двухпавярховых цягнікоў). Па лініі харчовай прамысловасці плануецца адкрыццё ў Магілёве сумеснага прадпрыемства — гаворка ідзе пра кукурузу.

«Мы таксама вядзём размову пра тое, што абедзве краіны ў хуткім часе збіраюцца выкарыстоўваць атамную энергію ў мірных мэтах. Таму адкрываецца магчымасць для развіцця супрацоўніцтва ў галіне абмену вопытам, інжынірынгу ў рамках стварэння атамных праектаў», — сказаў ён.

Міністр адзначыў, што Венгрыя з'яўляецца прыхільнікам больш цеснага супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю, і такіх у Еўропе ўсё больш.

У гэты ж дзень адбыліся сустрэчы міністра замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Румасам, міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, міністрам эканомікі Дзмітрыем Крутым, міністрам спорту і турызму Сяргеем Кавальчуком, міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Леанідам Зайцам і міністрам прамысловасці Паўлам Уцюпіным.

Акрамя таго, венгерскі міністр выступіў перад студэнтамі факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Тэма — міграцыя і будучыня Еўрасаюза.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ГЭТА НЕПАРАЗУМЕННЕ ТРЭБА ЗАКАНЧВАЦЬ

## Прэзідэнт ёмістa выказаўся аб украінскім канфлікце

**Гэта адбылося на сустрэчы з украінскім палітычным і дзяржаўным дзеячам Віктарам Медзведчуком.**

«Праблем назапасілася столькі, што мне вельмі важна пачуць вашу пазіцыю, пункт гледжання па многіх пытаннях, асабліва па пытаннях падзей, якія разгортваюцца ў нашай роднай Украіне, — адзначыў у пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы. — Для мяне гэта важна не толькі таму, што я асабіста хварэю за тое, што там адбываецца, але і таму, што гэта наша родная Украіна. Я і служыў, і шмат разоў бываў там. Ды і не хаваю, што мае старажытныя карані сыходзяць кудысьці там паміж Чарнігавам і Кіевам».

Беларускі лідар адзначыў, што асновай усяго з'яўляюцца адносіны Беларусі і Украіны. Ён нагадаў, што ў пачатку канфлікту, па нашых звестках, да 150 тысяч чалавек хлынула ў Беларусь з Украіны. Ім былі дадзены роўныя ўмовы і правы з грамадзянамі Беларусі.

«Я схільны да таго, што гэта непаразуменне — інакш не назавеш — трэба заканчваць. Брацкія рэспублікі, народы, ну проста браты — робім нашым ворагам і сапернікам падарунак сваімі рукамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не настолькі дасведчаны аб цяперашнім стане спраў, як яго суразмоўнік. «Вы валодаеце інфармацыяй і пра палітыку, унутраную кухню, якая ідзе разгортваецца. І з пункту гледжання далейшых паводзін Беларусі нам вельмі важная ваша інфармацыя», — сказаў Прэзідэнт і папрасіў суразмоўніка сарыентаваць у гэтай сітуацыі. «Я павінен ці пераканацца ў сваёй пазіцыі, ці адысці ад яе, калі не маю рацыі», — дадаў ён.

У адказ Віктар Медзвядчук падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за магчымасць сустрэчы, а таксама за цёплыя словы пра Украіну, паколькі сёння гэтая краіна перажывае шматлікія праблемы. Ён адзначыў асабістую ролю Прэзідэнта і ролю Беларусі ў мірным урэгуляванні сітуацыі на Данбасе, нагадаў пра тое, што беларускі бок даў пляцоўку, на якой былі прыняты вядомыя Мінскія пагадненні.

«Нягледзячы на тое, што яны, на вялікі жаль, не выконваюцца, гэта адзінае пагадненне, якое існуе, як план мірнага ўрэгулявання на Данбасе. І ўсё ж такі ўсе бакі, пачынаючы ад Масквы, Мінска, Вашынгтона, Парыжа, Берліна, Кіева, Данецка і Луганска, разумеюць тое, што мір можа быць толькі на ўмовах, падпісаных у Мінску», — падкрэсліў Віктар Медзвядчук.

Паводле яго слоў, для многіх украінцаў, якія жадаюць міру на Данбасе, Мінск стаў не проста пляцоўкай, дадзенай брацкім беларускім народам, але і надзеяй і мэтай у тым, што мірнае ўрэгуляванне ўсё ж такі наступіць.

Вынікі сустрэчы Віктар Медзвядчук пракаментаваў журналістам.

Гэтым разам ён прыехаў у Мінск выключна для сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Украінскі палітычны дзеяч адзначыў, што беларускі лідар ніколі не быў абыякавы да сітуацыі ў суседняй краіне, тым больш цяпер, паколькі сёлета там пройдуць прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. Фактычна, гаворка ідзе пра абнаўленне ўлады — гэта і стала галоўным прадметам гутаркі.

Таксама Віктар Медзвядчук ацаніў беларуска-ўкраінскія адносіны, назваў іх характар дружалюбным. Ён нагадаў, што кіраўнік беларускай дзяржавы рэгулярна бярэ на сябе пасрэдніцкія функцыі ў пытаннях мірнага ўрэгулявання адносін паміж Украінай і Расіяй. Як прыхільнік аднаўлення сяброўскіх украінска-расійскіх адносін, Медзвядчук назваў такую місію Прэзідэнта вельмі ганаровай, а таксама вельмі важнай і неабходнай для Украіны.

Аляксандр Лукашэнка неаднойчы заяўляў, што Беларусь можа адыграць больш актыўную ролю ў вырашэнні канфлікту, прапаноўваў сесці за адзін стол перагавораў прадстаўнікам трох славянскіх народаў. Ці чуюць гэтую пазіцыю? Украінскі палітычны дзеяч падкрэсліў: так, яе чуюць і ў Кіеве, і ў Маскве. Ён таксама падкрэсліў, што, можа, гэта пазіцыя адкрыта і публічна не выказваецца, у тым ліку для СМІ, але яна рэалізуецца.

«Я тут прыхільнік падтрымаць пункт гледжання Аляксандра Рыгоравіча ў тым, што тры славянскія народы павінны дамовіцца самі. Улічваючы, што ў гэтым канфлікце не ўдзельнічае беларускі народ, яму якраз і можа быць адведзена гэтая роля пасрэдніка, роля таго народа, які можа памірыць тое, што адбылося паміж Украінай і Расіяй», — заявіў Віктар Медзвядчук.

Ён таксама адзначыў, што на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі абмяркоўваўся шэраг пытанняў наладжвання супрацоўніцтва ў рамках мірнага ўрэгулявання канфлікту. Гаварылі і аб гандлёва-эканамічнай сітуацыі паміж Беларуссю і Украінай. Дарэчы, Віктар Медзвядчук звярнуў увагу, што Аляксандр Лукашэнка паводле апошніх сацыялагічных апытанняў з'яўляецца самым аўтарытэтным кіраўніком замежнай дзяржавы для ўкраінцаў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер Грэцыі ўнёс у парламент пытанне аб даверы ўраду



Прадстаўнікі партыі «Незалежныя грэкі» (АНЭЛ) выходзяць са складу грэчаскага ўрада, паведамляе ТАСС. Аб выхадзе абвясціў лідар партыі, міністр нацыянальнай абароны Грэцыі Панас Каменас. Пасля сустрэчы з прэм'ер-міністрам Алексісам Цыпрасам ён паведаміў, што падзякаваў прэм'еру Цыпрасу за чатырохгадовае супрацоўніцтва і заявіў, што не можа паступіцца прынцыпамі. На сустрэчы абмяркоўваўся лёс кабінета пасля адабрэння парламентам Македоніі змен у канстытуцыі, якія прадугледжваюць перайменаванне суседняй з Грэцыяй краіны ў Паўночную Македонію. «Незалежныя грэкі» выступаюць катэгарычна супраць перадачы суседняй краіне права афіцыйна выкарыстоўваць у сваёй назве слова «Македонія». Прэм'ер-міністр Грэцыі Алексіс Цыпрас заявіў, што паставіў перад старшынёй парламента Нікасам Вуцысам пытанне аб даверы ўраду. Грэчаскі прэм'ер у заяве, якую перадавала ў прамым эфіры грамадскае тэлебачанне ERT, сказаў, што прыняў адстаўку міністра нацыянальнай абароны Каменаса. На гэтую пасаду прызначаны начальнік генштаба нацыянальнай абароны Эвангелас Апосталакіс. «Я ўпэўнены, што мы атрымаем вотум даверу і ўрад завершыць адведзены яму чатырохгадовы тэрмін, чарговыя выбары адбудуцца ўвосень», — сказаў прэм'ер. Вуцыс заявіў журналістам, што пытанне аб даверы кабінету парламент пачне абмяркоўваць сёння. Галасаванне пройдзе ў чацвер.

## Пампеа заклікаў да стварэння саюза краін Персідскага заліва, Егіпта і Іарданіі



Злучаныя Штаты разлічваюць на стварэнне альянсу з шасці краін Персідскага заліва, Іарданіі і Егіпта, заявіў на прэс-канферэнцыі дзяржсакратар ЗША Майкл Пампеа па выніках першага амерыканска-катарскага дыялогу ў Досе. Пампеа здзяйсняў турнэ па арабскіх краінах, якія з чэрвеня 2017 года знаходзяцца ў канфлікце з Катарам. Ён пабываў у Іарданіі, Егіпце і прыбыў у Доху са сталіцы ААЭ Абу-Дабі, дзе правёў перагаворы з эмірацкім кіраўніцтвам, якое выступае супраць наладжвання стасункаў з Дохай. «Канфлікты шкодзяць шматбаковым адносінам. Мы хочам аднавіць адзінства краін Персідскага заліва, каб яны зноў былі прыкладам для іншых краін рэгіёна», — сказаў Пампеа. Паводле яго слоў, канфлікт паміж Катарам і яго суседзямі занадта зацягнуўся. «Мы ўсё мацнейшыя, калі дзейнічаем разам, і канфлікты абмяжоўваюць, калі ў нас ёсць агульныя выклікі, рознагалоссі паміж краінамі з агульнымі мэтамі ніколі не ідуць на карысць», — дадаў дзяржсакратар ЗША.

## У Японіі работнікі недаатрымалі амаль паўмільярда долараў



Міністэрства аховы здароўя, працы і дабрабыту Японіі больш за 20 гадоў падрыхтоўвала недакладныя статыстычныя звесткі, якія прывялі да нявыплаты 53,7 мільярда іен (звыш 497 млн долараў па бягучым курсе) для больш чым 19,73 мільёна чалавек па ўсёй краіне, перадае ТАСС. Як аб'явіла ведамства, пасля праведзенай праверкі высветлілася, што недакладнасці ў статыстычных даных з'явіліся яшчэ ў 1996 годзе. Яны адбіліся на розных выплатах японскім рабочым і служачым, уключаючы страхавыя выплаты і прэміяльныя. Міністэрства прынесла афіцыйныя прабачэнні і паабяцала, што выплаціць усім пацярпелым належныя ім сродкі. У той жа час мінпрацы падкрэсліла, што тыя, хто з-за памылак у даных калі-небудзь атрымліваў большыя выплаты, чым ім на самай справе належала, не павінны будуць вяртаць грошы. Выяўленыя недакладнасці ў даных ужо прывялі да таго, што ўрад краіны быў вымушаны распачаць перагляд праекта бюджэту на 2019 фінансавы год, які пачнецца ў краіне першага красавіка.